## У 2026 г. спаўняецца

## 750 гадоў з пачатку будаўніцтва (1276) Камянецкай вежы, помніка абарончага дойлідства

Камянецкая вежа (Камянецкі стоўп, Белая вежа) – помнік абарончага дойлідства канца XIII ст., узор ваенна-інжынернага мастацтва. Гэта адзіная пабудова з групы так званых валынскіх вежаў, якая захавалася.

Гісторыя вежы цесна звязана з Камянцом, які ўзнік як горад-крэпасць на паўночнай мяжы Уладзіміра-Валынскага княства. Дакладная дата яе збудавання невядома. Паводле Іпацьеўскага летапісу вежа ўзводзілася паміж 1276 і 1288 гг. дойлідам Алексам па загадзе валынскага князя Уладзіміра Васількавіча. Размешчана на ўзгорку на левым беразе р. Лясной. Вежа доўгія стагоддзі з'яўлялася галоўным абарончым фарпостам сістэмы ўмацавання Камянца і служыла месцам укрыцця пры нападзе яцвягаў і татар. Таксама магла выконваць функцыі рэзідэнцыі. У 1375, 1378 і 1379 гг. Камянец падвяргаўся нападам тэўтонскіх рыцараў. У 1382 г. быў захоплены польскім князем Янушам Мазавецкім. У 1383 г. пасля сямідзённай асады заняты вялікім князем літоўскім Ягайлам. З 1392 г. Камянец стаў развівацца як значны гандлёвы і палітычны цэнтр, што абумовіла неабходнасць пастаяннага ўмацавання горада, на які неаднаразова рабілі набегі крыжаносцы. У 1500 г. вежа паспяхова вытрымала асаду крымскіх татар. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654–1667) Камянец і яго ўмацаванні значна пацярпелі ад баявых дзеянняў. Паступова Камянецкая вежа страціла сваё абарончае значэнне. У 1837 г. падрыхтавана першая публікацыя па яе гісторыі, аўтарам якой быў Ігнат Кулакоўскі. У 1897 г. было прынята рашэнне аб рэстаўрацыі старажытнага помніка. У сувязі з гэтым у 1899 г. па заданні Імператарскай археалагічнай камісіі вежу даследаваў акадэмік У. В. Суслаў. У 1903–1905 гг. былі выкананы аднаўленчыя работы пад кіраўніцтвам архітэктара П. П. Пакрышкіна. У 1970 г. каля вежы праводзіліся раскопкі, якія ўзначальваў беларускі археолаг М. А. Ткачоў.

Камянецкая вежа мае шмат агульнага з вежамі тыпу «данжон», пашыранымі ў XII–XIII стст. у краінах Заходняй Еўропы. Выканана яна ў раманскім стылі з элементамі ранняй готыкі. У сувязі са сваім першапачатковым прызначэннем мае простае і строгае аблічча. Вежа з трох бакоў была акружана земляным валам і абарончым ровам, з чацвёртага – ракой. Мае круглую форму, вонкавы дыяметр – 13,6 м. Таўшчыня сцен – 2,5 м. Агульная вышыня вежы (ад фундамента да верху зубцоў) – 30 м. Стаіць на падмурку з бутавага каменю, перасыпанага пяском. Сцены складзены з двухколернай брусчатай цэглы цёмна-чырвонага і жаўтаватага колераў. У іх звонку і ўнутры – вялікая колькасць прамавугольных адтулін і прарэзаных байніц, паміж якімі размешчаны плоскія нішы. Пяць ярусаў злучаны паміж сабой драўлянымі лесвіцамі, з пятага яруса наверх вядуць цагляныя ўсходы. Важным элементам вежы з'яўляецца баявая пляцоўка, акружаная 14 зубцамі. На паверхні фасада размешчаны пояс з чатырох радоў цэглы, вокны маюць стрэльчатую форму, у верхнім ярусе ўпрыгожана дэкаратыўнымі нішамі, над праёмамі чацвёртага яруса – аркі.

У 2004 г. Камянецкая вежа ўнесена ў папярэдні спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА як помнік абарончага дойлідства, у 2007 г. – у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Недалёка ад вежы ўстаноўлены помнік князю Уладзіміру Васількавічу. З 1960 г. у вежы размешчаны філіял Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея.